Бараш Ю.С., студэнт 114 группы
заочной формы обучения
Научный руководитель – Алехнович О.М.,
кандидат филологических наук, профессор

# МІФАЛАГІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ Ў РЭЖЫСУРЫ НАРОДНАГА СВЯТА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актуальнасць тэмы абумоўлена шырокім выкарыстаннем фальклорнага матэрыялу, міфалагічных персанафікацый ў рэжысуры народнага свята. У працэсе падрыхтоўкі ад рэжысѐра патрабуецца высокая адукаванасць і глыбокае разуменне этымалогіі міфалагічнага вобраза. Павярхоўнае валоданне міфалагічнай падаплѐкай абрада, выкарыстанне крыніц сумнѐўнай аўтарытэтнасці вядуць да некарэктнай перадачы народнага светапогляду і самой семантыкі свята.

У працэсе падрыхтоўкі да канфэрэнцыі высвятлілася вялікая колькасць матэрыялу, мяне вельмі зацікавіў сучасны артыкул Р.М. Кавалѐвай. Аўтар разглядае міфалагічныя вобразы як хранонімы, што вельмі выразна, зразумела тлумачыць іх паходжанне і ўзаемаадносіны ў кантэксце беларускага народнага календара.[5]

Суадносіны паміж фальклорам і міфалогіяй як гістарычнымі формамі духоўнай культуры – важная праблема, якая з’яўляецца абшырнай, невычэрпнай тэмай навуковых даследванняў у сфэрах філалогіі, фальклnetwork, этнаграфіі, этналінгвістыкі і інш. Пры даследаванні календарнай абраднасці глыбока раскрываецца міфалагічны кантэкст культуры беларускага народнага календара.

З пакон вякоў чалавек імкнуўся зразумець, аналізаваць навакольны свет і сваѐ месца ў ім. На працягу некалькіх тысячагоддзяў у працэсе ўзаемадзеяння чалавека з прыродай, у ходзе пазнання ім навакольнага свету ў яго арганічным адзінстве з космасам, чалавецтвам ствараецца жыццядайны пласт духоўнасці – каляндарна-абрадавы фальклор. Каляндарна-абрадавая

творчасць, або паэзія земляробчага календара, ахоплівала сабой асноўныя сферы быцця і жыццядзейнасці чалавека. Яна суправаджала яго ў штодзѐнным жыцці, арыентавала ў сацыяльнай практыцы дачыненняў з людзьмі і светам. Яна арганізоўвала соцыум і асвячала яго духоўна. У традыцыйнай народнай культуры, у каляндарным фальклоры, у архаічных абрадавых практыках, родаважанравай сістэме паэтычнага слова скандэнсаваны унікальны працоўны, маральна-этычны і эстэтычны вопыт мільѐнаў безыменных аратых і сейбітаў, ваяроў і рамеснікаў, ведуноў-празарлівцаў, а першнаперш аналітыкаў жыцця, прыродных філосафаў, мудрасловаў, паэтаў і музыкаў.

Вучоныя доказна сведчаць, што чалавек першабытна-абшчыннага грамадства мысліў ужо мастацка-вобразна. Ды, зрэшты, што такое адна з самых ранніх форм вуснай калектыўнай творчасці — міф, міфалогія ў цэлым, як не спосаб з успамогай мастацка-вобразнага мыслення асэнсаваць навакольны свет, прыродны ландшафт, касмічную сферу? [2]

З цягам часу змянялася стаўленне да матываў паэтыкі народнага календара. Савецкія фалькларысты імкнуліся адхрысціцца ад міфарытуальнага складніка каляндарнай абраднасці, зводзячы яе да адной з функцый - да аграрнай магіі. Вельмі прыцягальнай аказалася матэрыялістычная канцэпцыя фальклору, агучаная А. М. Горкім. Пісьменнік прапаноўваў за кожным узлѐтам народнай фантазіі шукаць яе ўзбуджальнік - працу і імкненне народа, хаця б ва ўяўленні, аблегчыць і вынікізаваць яе.

Сучасныя ж даследчыкі ўпэўнена могуць заявіць што аграрна-магічная функцыя абрадаў, безумоўна, важная іх рыса, але далѐка не галоўная, не магістральная і не адзіная. Трэба разумець, што рытуальнае прызначэнне абрада накіравана не столькі на спробу магічнага ўздзеяння на прыроднае асяроддзе, колькі на падрыхтоўку самога чалавека, сунастрой і падпарадкаванне прыродным каляндарным зменам. ―Закрыццё" аднаго перыяду і гарманічнага пераходу ў наступны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, адкрываюцца новыя перспектывы вывучэння не проста народнага календара, а каляндарнай абраднасці комплексна. Няцяжка заўважыць, што зараз ужо і ў фалькларыстычных працах аўтары смела аперуюць паняццямі хаос/космас, дэструктуралізаваны свет/адноўлены свет, стары год/новы год. Ці не агульным месцам стала акцэнтаванне ідэі крызіснага (навагодняга) часу, разрыву прасторы і часу, парушэнні раўнавагі паміж станоўчым і адмоўным полюсамі быцця (гэта значыць паміж жыццѐм і смерцю), які падлягае рытуальнаму аднаўленню.

Навукоўцы карыстаюцца рознымі падыходамі ў высвятленні паходжання міфалагічных вобразаў і пытанняў іх інтэграцыі ў вуснапаэтычныя тэксты. Генетычны кірунак міфафальклярыстыкі, арыентаваны ў тым ліку на апісанне семантыкі міфалагічных вобразаў, нараўне з пераканаўчымі тлумачэннямі адзначыўся шэрагам фантастычных, тыпу «Купала – бог пладоў зямных", "Каляда - баство весялосці і радасці", "Рай - дэман-апекун увабранага ўраджаю», «Спорыш - баство ўрадлівасці» і пад. Дзівіцца тут няма чаму. На жаль, заслона часу хавае глыбінны сэнс міфалагем настолькі, што іх этымалагічная інтэрпрэтацыя спараджае новыя пытанні і дае альтэрнатыўныя варыянты. Тут назіраюцца дзве тэндэнцыі. Першая: трывалае, пераходзячае з кнігі ў кнігу, аднак вельмі ўмоўнае, павярхоўнае, часам адвольнае тлумачэнне імя міфалагічнага вобраза. Так здарылася з Калядой, чыѐ найменне выводзілася з лац. *calendae* і якое прадугледжвае запазычанне славянамі, ледзь не напрамую, рымскай традыцыі святкавання зімовых навагодніх календ, як быццам да рымлян праславяне ўвогуле знаходзіліся па-за часам. Насамрэч, на працягу стагоддзяў каляндарны вобраз Каляды быў міфалагічнай персаніфікацыяй кола часу, канцэнтраваў уяўленні аб яго руху іператварэнні. Час перадаваўся праз глабальную прасторавую катэгорыю круга, акружнасці, кола, яго вобада. Адсюль вытокі песеннага матыва прыхода або прыезда Каляды.

Другая: настолькі значнае разыходжанне ў меркаваннях, як, напрыклад, у выпадку з Купалам, што ствараецца ўражанне, быццам аб агульным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаменацелі не варта і марыць. Аднак гэта зусім ня так. Дастаткова абраць падыход да каляндарных вобразаў як да міфахранонімаў, каб пераканацца ў адваротным.[5]

Хранонім – уласнае імя адрэзка часу. Даследчыкамі адзначана іх –асаблівая прырода", якая заключаецца ў спыцыфічным спосабе адлюстравання нацыянальных культурных рэалій (звычак, традыцый, побыту), нацыянальнага светаўспрымання.[4]

У каляндарнай абраднасці нашых продкаў час ўспрымаўся як круг ці кола з двума галоўнымі кропкамі, якія сіметрычна маркіруюць зімовае і летняе сонцастаянні. У народным святочным календары ім адпавядалі комплексныя абрады - калядны, які завяршаў адзін гадавы цыкл і адкрываў новы, і купальскі. Абодва абрады мелі трохчасткавую структуру і, што самае цікавае, агульную схему інтэграцыі вобразаў Каляды і Купалы ў прастору абраднасці. Тая ж самая інтэграцыйная мадэль выяўляецца ў двух іншых абыходных абрадах - валачобным і куставым, так жа, як і папярэднія, яны адносяцца да каляндарных «пачаткаў»: валачобны – да пачатку вясновага года, куставы - да пачатку летняга, купальскі, адпаведна, да пачатку новага паўгоддзя, калядны - да пачатку новага цыкла. Такім чынам, мы можам разглядаць міфалагічныя вобразы Каляды, Куста, Купалы як міфахранонімы.

Купала маркіраваў сярэдзіну гадавога цыклу, звязанага з сонечным апагеем. Кампанентамі песеннай выявы Купалы з'яўляюцца наступныя сэнсы: непадзеленае і гарманічнае, мужчынскае і жаночае, агонь і вада, дзева і маці. Семантычна дваістае імя Купала мае у сваѐй аснове індаеўрапейскі шлюбны міф. На мяжы двух паўгоддзяў суб'ектамі міфа становяцца сонца і зямля, якія знаходзяцца ў апафеозе сваіх сіл. У гэты урочны начны час яны закіпаюць бязмежным касмічным запалам, які прымушае квітнець нават папараць, але і здольны спапяліць свет, калі б гэта полымя кахання не астуджалася прасвяднай вадой - сімвалам шлюбу. Адсюль купанне досвіткам хлопцаў і дзяўчат, якія аднаўляюць міфалагему святога шлюбу, саюза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тлумачэнне купальскага вогнішча можна разглядаць не толькі як сімвала сонца.

Базавыя міфахранонімы першапачаткова «абслугоўвалі» глабальны культ цыклічнага часу, натуральна злучаны з культам расліннасці, які ў далейшым папоўніўся культам продкаў і земляробчым. Апошняе прывяло да дзялення гадавога круга ўжо не на два, а на чатыры сезоны з акцэнтаваннем вясны, якую ў песнях сталі заклікаць нароўні з летам, самі ж песні атрымалі назву вяснянак.

Часавая субстанцыяльнасць складае жывую сутнасць і праз не такіх выразных, як Каляда, міфахранонімаў: Масленіца, Вясна, Юра, Май, Куст - любы хранонім нясе ў сабе ідэю канца і пачатка. Нашы продкі ўяўлялі каляндар не суматыўным абразаваннем, а арганічным цэлым, энергетычна злучаючым асобныя часткі ў таямнічую гармонію кола часу.

Каляндарна-абрадавыя міфахранонімы – гэта ня проста міфарытуальны сэнс абраду, яны нешта большае, значнае - носьбіты следу спарадзшўшай іх эпохі, аскепкі пра-мовы, квінтэсенцыя сэнсу, звязанага з разуменнем самай глыбокай таямніцы светабудовы - таямніцы часу. Характэрна, што беларусы, можа, нават у большай ступені, чым іншыя народы, засталіся носьбітамі старажытнай сістэмы каляндарных сімвалаў, звязаных з ідэяй цэласнасці цыклічнага часу, адлюстраванай у народных песнях.

Беларускі народны каляндар раскрывае перад намі складаны светапогляд беларусаў, іх глыбокае веданне прыроды і любоў да яе, цягавітасць да працы, дэманструе багатыя творчыя здольнасці, невычэрпную фантазію, палѐт дапытлівай думкі.[1]

―Не хлебам адзіным жывы чалавек" і не адзіным земляробчым клопатам поўніцца народны каляндар. Спрадвечнае імкненне да разумення прыроднага наваколля, космасу, мовы жывѐл і раслін, а галоўнае - свайго месца ў гэтым гарманічна існуючым асяроддзі знайшло сваѐ ўвасабленне ў міфалагічным вобразе Папараць-кветкі. Яе пошукам прысвечаны жыццѐвы шлях як старажытных, так і сучасных беларусаў. Менавіта ў прыродзе закладзена ўсѐ,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што трэба ведаць чалавеку аб самім сабе. У прыродзе ѐсць усе адказы на любыя пытанні. Дзякуючы прыродзе чалавек можа атрымліваць усѐ, што жадае. Але для гэтага трэба пазнаѐміцца з ѐй вельмі шчыльна, трэба навучыцца жыць з ѐй у гармоніі і валодаць яе мовай. Веды даюць сілу, а веды, падмацаваныя векавечным досведам, надзяляюць магутнасцю. І гэтая сіла заўсѐды была і ѐсць унутры нас, у нашай крыві, у нашай памяці.

Пажадана, каб маладыя, пачынаючыя рэжысѐры у сваѐй працы грунтаваліся на асабістым вопыце, здабытым у самастойным няўпынным даследванні Беларускай культуры і досведзе сучасных айчынных навукоўцаў. На мой погляд, гэта адзіны шлях да актуалізацыі народнага свята, яго ―зразумеласці” ці ―блізказці” сучаснаму, пераважна урбанізаванаму, ўдзельніку і гледачу. Глыбінны сэнс народнага свята, абрада і адпаведных міфалагічных вобразаў, яму ўласных, значна шырэй, чым распаўсюджаныя сѐння мадыфікацыі народнага свята.

## СПІС ВЫКАРАСТЫНЫХ КРЫНІЦ

1. Беларускі Народны Каляндар” У.А.Васілевіч, Мінск 1993.
2. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў” А.С.Ліс, Мінск 1998.
3. Культура Беларусі. Энцыклапедыя” т.5, Мінск 2010.
4. Слоўнік рускай анамастычнай тэрміналогіі” Н.В.Падольская, 1978.
5. Фальклярыстычныя даследаванні. Выпуск 10” Римма Ковалева ―Именная интеграция мифологического в пространство народного календаря и календарной обрядности”, 2014.

Баринова Я.А., студент группы 416а(с)
дневной формы обучения
Научный руководитель – Шедова Е.В.,
кандидат искусствоведения, доцент

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ